

# КАГО ПАМЯТАЕМ, ЖЫВУЦЬ

НА ЗДЫМКАХ: мітынг-рэквіем ля помніка ахвярам Лахвенскага гета. На пярэднім плане з вянкамі ад працоўных калектываў дырэктар Любанскага СДК М.С. Яраховіч і загадчык Барсукоўскага клуба В.А. Комар (уверсе); свечкі памяці ў руках жыхароў Кажан-Гарадка на мітынгу ля помніка ахвярам Кажан-Гарадоцкага гета.

„Родныя вы нашы.

У смутку вялікім схіліўшы галовы, стаім перад вамі.

Вы не скарыліся лютым забойцам у чорныя дні фашысцкай навалы.

Вы смерць прынялі, ды полымя сэрцаў вашай любові да Айчыны навек незгасальнае.

Памяць пра вас у нас назаўсёды, як неўміруча наша зямля і як вечна яркае сонца над ёю".




# СПЕЦ «ЛН» ВЫПУСК

„ЛУНІНЕЦКІЯ НАВІНЫ"

25 жніўня 1992 г.

№ 94 (7075)

Цана 22 кап., у розніцу – 30 кап.


ГЭТЫ НУМАР ГАЗЕТЫ ПРЫСВЕЧАНЫ ДНЮ ПАМІНАННЯ АХВЯР ВАЙНЫ СЯРОД МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА, ЯКІ АДБЫЎСЯ НА ЛУНІНЕЧЧЫНЕ.

СЛОВАМІ жальбы, вынесенымі на пачатак фотарасповяду, заканчваўся дзень памінання ахвяр вайны, але гэтыя словы былі рэфрэнам усіх выступленняў і разважанняў пры гэтай падзеі, якая адбывалася на працягу амаль тыдня ў розных мясцінах Лунінеччыны.

Выпадковае супадзенне: у раёне ў гэтыя дні палалі пажары. І хаця нават параўноўваць нельга цяперашнюю пажарную небяспеку з сапраўдным зарывам вайны, тым не менш полымя вогнішчаў і выпаленыя ўчасткі лесу прымушалі ўздрыгануць людзей больш сталага ўзросту, нагадаўшы аб палаючых хатах і папялішчах на месцы дамоў, якія не паўсюдна за 50 гадоў адбудаваліся.

Лунінецкія вёскі... Аддаўшы Айчыне сваю моцную палову, яны засталіся безабароннымі перад акупантамі. Гісторыя апраўдвае гібель воінаў. Такі ўжо лёс салдата: ці грудзі ў крыжах, ці галава ў кустах, смерць за Айчыну — святая справа. Але ніколі чалавецтва не павінна даравань фашысцкім захопнікам вайну супраць мірнага насельніцтва, супраць дзяцей, жанчын, старых.

Аказваецца, далёка не поўныя звесткі захоўваюцца ў архівах. Атрымліваем дадзеныя адтуль, апытваем старажылаў у час падворных абыходаў, але пасля апублікавання ў газеце спісаў загінуўшых шматлікія званкі і звароты ў камісію па стварэнню Кнігі „Памяць" пастаянна дапаўняюць гэты трагічны, чорны мартыралог вайны.

На мемарыяльных могілках у сусветна вядомай Хатыні ўвекавечаны толькі тры нашы вёскі: Сітніцкі Двор, Лугі, Меляснiца. Ушанавана памяць адпаведна пра чатырохсот восемдзесят, сто трыццаць сем і сто пяцьдзесят дзевяць іх жыхароў. Сціплыя абеліскі яшчэ ў дзесятках вёсак раёна нагадваюць аб тысячах ні ў чым не павінных людзей, якія закатаваны гітлераўскімі карнікамі.

ЗА ТРЫ гады фашысцкай акупацыі (а яна на Лунінеччыне працягвалася з 10 ліпеня 1941 г. па 10 ліпеня 1944 г.) была знішчана большая частка яўрэйскага насельніцтва раёна, якое да




# АКТ РАССЛЕДАВАННЯ

**злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на часова акупіраванай тэрыторыі Лунінецкага раёна Пінскай вобласці**
**10 красавіка 1945 г.**

Лунінецкая раённая камісія садзейнічання ў рабоце Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі па расследаванню і ўстанаўленню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў правяла расследаванне фактаў знішчэння савецкіх грамадзян нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Лунінецкага раёна ў перыяд часовай акупацыі.

Матэрыяламі следства, аглядам месцаў знішчэння і пахавання, а таксама шляхам апытання сведкаў, ідавочцаў і мясцовых жыхароў камісія ўстанавіла:

на працягу ўсяго перыяду часовай акупацыі тэрыторыі Лунінецкага раёна нямецка-фашысцкія захопнікі праводзілі масавыя сістэматычныя знішчэнні мірных грамадзян і ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі.

У наваколлях г. Лунінец камісія даследавала магілы масавых ахвяр фашысцкага тэрору:

ва ўрочышчы „Мачула" выяўлена сем магіл, размешчаных у 400 м на поўнач ад сеннай базы пры насыпу запасной чыгуначнай веткі Лунінец-Пінск. Размер кожнай з трох невялікіх магіл: 6 х 2,5 м, размер кожнай з чатырох меншых магіл: 4 х 1,5 м. У гэтых сямі магілах пахаваны 1.312 чалавек мужчын;

ва ўрочышчы „Бараўшчына" выяўлена магіла размерам 50 х 4 х 3 м, размешчаная на поўнач ад урочышча „Мачула" на адлегласці 150 м ад чыгуначнай дарогі Пінск—Лунінец і прымыкаючай да насыпу запасной чыгуначнай веткі Лунінец-Баранавічы. У гэтай магіле захаваны 2.932 чалавекі, з іх жанчын 1.429 і дзяцей 1.397;

ва ўрочышчы „Баханова" выяўлена 3 вялікія і 186 малых магіл. Размер кожнай вялікай магілы: 12 х 4 х 2,5 м, размер малых магіл — розны.

З паказанняў сведкаў, відавочцаў, Жука Уладзіміра Сцяпанавіча, пражываючага ў г. Лунінец, вул. Сенная, 12, і Аляшкевіча Пракопа Акімавіча, пражываючага ў г. Лунінец, вул. Легаўская, 34, і з апытанняў іншых мясцовых жыхароў устаноўлена:

у пачатку жніўня 1941 г. па заданню мясцовых органаў „СД" гарадская ўправа Лунінца аб'явіла збор мужчын-яўрэяў пад відам праверкі дакументаў і ўстанаўлення спецыяльнасці. Акрамя дакументаў, ім было загадана ўзяць з сабой рыдлёўкі, сякеры і пілы, быццам іх адправяць на работу пасля праверкі дакументаў. Сабраўшыхся пад канвоем нямецкай жандармерыі павялі ва ўрочышча „Мачула", загадзя ацэпленае немцамі. Тут частку прыведзеных прымусілі выкапаць ямкі. Перад кожнай ямкай яўрэяў па 10 чалавек прымушалі лажыцца на зямлю тварам уніз. Ляжачых нямецкія каты расстрэльвалі ва ўпор у патыліцу, а астаўшыхся ў жывых прымушалі скідваць забітых у ямкі і самім лажыцца на іх месца. Супраціўляючыхся расстрэльвалі на месцы.

4 верасня 1942 г. нямецкія каты, ацапіўшы гета, пад узмоцненым канвоем вывелі застаўшаеся ў жывых яўрэйскае насельніцтва Лунінца ва ўрочышча „Бараўшчына" да загадзя выкапанай ямкі. Тут яўрэяў прымусілі распранацца дагала і складваць мужчынскае адзенне асобна ад жаночага. Распранутых прымушалі лажыцца ля ямкі тварам уніз, пасля чаго фашысты расстрэльвалі ляжачых ва ўпор у патыліцу.

Ва ўрочышчы „Баханова" нямецкія фашысты расстрэльвалі як цэлыя групы, так і асобных савецкіх грамадзян, якіх закапвалі ў загадзя выкапаных ямках. За перыяд акупацыі нямецкая паліцыя і жандармерыя знішчыла і пахавала тут 805 чалавек мірных жыхароў, у тым ліку 336 жанчын і 205 дзяцей, а таксама 2.813 ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі. У ямках урочышча „Баханова" закапвалі і павешаных савецкіх грамадзян, якіх нямецкія каты вешалі ў лесе, непасрэдна прымыкаючым да ўсходняга боку г. Лунінец і размешчаны ў 200 м ад урочышча „Баханова". Колькасць павешаных немцамі за перыяд акупацыі складае 132 чалавекі, у тым ліку 11 жанчын. Акрамя таго, ад нямецкай паветранай бамбардзіроўкі 27 чэрвеня 1941 года загінулі 203 чалавекі мясцовага насельніцтва, якія пахаваны ў 200 м на захад ад хрысціянскіх могілак.

вайны пражывала пераважна ў Лунінцы, Лахве, Кажан-Гарадку, Мікашэвічах, а таксама ў Луніне, Чучавічах, Велуце, Сінкевічах, Мокраве, Вульцы 2-й (згодна з дадзенымі Пінскага філіялу дзяржархіву). Пасля вайны ў вёсках не засталося яўрэяў, але на месцах масавых расстрэлаў паўсюдна былі пастаўлены помнікі ў памяць пра гэтыя трагедыі. На жаль, імкненне да прымусовага зліяння нацый у той час не дазволіла нават ужыць слова „яўрэйскія" у надмагільных надпісах — паўсюдна ўказваюцца „савецкія грамадзяне".

Трагедыя яўрэйства для многіх перастала быць „белай плямай" у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны толькі ў мінулым годзе, калі малую радзіму наведалі выхадцы з Лахвы, якія цяпер жывуць у Ізраілі (пра гэта газета паведамляла ў №№ 67 і 70 за 1991 г.).

Сёлета — новая сустрэча з былымі землякамі, на гэты раз з ураджэнцамі Лунінца і Кажан-Гарадка, якія таксама прынялі ўдзел ва ўрачыстажалобных цырымоніях дня памінання ахвяр вайны.

3 верасня 1942 года пачалася злавесная акцыя фашыстаў супраць яўрэйскага насельніцтва Лунінеччыны. Прызвычаіўшыся да пакорнага падпарадкавання волі лёсу тысяч яўрэяў, пацярпеўшых толькі за сваю нацыянальнасць, гітлераўцы недаацанілі чалавечай годнасці жыхароў Лахвы. Гета ўзнялося на паўстанне супраць забойцаў. Гэта было першае ўзброенае, хоць і прымітыўна, яўрэйскае супраціўленне фашыстам, якое ўвайшло ў гісторыю дыяспары і шырока вядома ў Ізраілі.

Канешне, сілы былі няроўныя. Канешне, Лахвенскае паўстанне было патоплена ў крыві. Але дзякуючы мужнасці і самаахвярнасці дзвюх тысяч людзей амаль шэсцьсот іх супляменнікаў змаглі выратавацца ўцёкамі ў час знішчэння.

АДЗІН з герояў Лахвенскага гета — Моўша Калпаніцкі. Яму было толькі 22 гады, а за плячыма — вучоба ў яўрэйскай школе, дапамога бацьку на лесапільным заводзе і млыну, які знаходзіўся ў вёсцы Чэланец (тады Ленінскага, цяпер Жыткавіцкага раёнаў). У маі 1941-га Моўша прайшоў прызыўную камісію і атрымаў назначэнне ў інжынерную воінскую часць, але стаць салдатам не паспеў — пачалася вайна.






Сям'я, як і тысячы іншых, апынулася ў гета. Моўша, рызыкуючы жыццём, клапаціўся не толькі пра сваіх родных. На начах ён пераплываў лодкай Смердзь і прывозіў харчы для самых слабых і галодных вязняў. Аднак яму мала было толькі пасіўнага выжывання за калючым дротам. Разам з Іцхакам Рахчыным Моўша стаў адным з арганізатараў паўстання.

На расказах мясцовых відавочцаў, калі раніцай 3 верасня яўрэі ўзняліся на адпор фашыстам, Моўша выбег з гета з сякерай. Забіўшы аднаго немца, ён замахнуўся на другога. Аднак падкошаны аўтаматнай чаргой фашыста ўпаў на зямлю. Да яго кінулася сяброўка Рыўка Хейфец і ўрач Ігельнік, відавочна, у спадзяванні выратаваць параненага. Але гэта ім не ўдалося. Фашысты застрэлілі ўсіх траіх на плошчы ў цэнтры Лахвы.

Пра гэта расказаў адзін з членаў дэлегацыі Ізраіля, ураджэнец Лахвы, брат загінуўшага Копл Калпаніцкі, якому пашчасціла выратавацца ў час знішчэння гета. Звяртаючыся да сваіх землякоў, ён сказаў, што Лахва заўсёды застанецца для яго і яго дзяцей самым святым кутком зямлі, таму што тут яго радзіма, тут знаходзіцца магіла яго родных.

Трэба адзначыць, што ініцыятарам рэканструкцыі помніка ахвярам Лахвенскага гета з'яўляецца арганізацыя выхадцаў Лахвы ў Ізраілі, сярод якіх актыўную ролю адыграў Копл Калпаніцкі. У мінулым годзе ён наведаў месца нараджэння з адным сынам, сёлета — з другім, на будучы год намераны прыехаць з трэцім. Відавочна, толькі жаданне і намаганні бацькоў змогуць дапамагчы юнаму пакаленню яўрэяў, якія нарадзіліся і выраслі ў Ізраілі, адчуць сваё дачыненне да зямлі, дзе нарадзіліся іх бацькі і якая застаецца для іх нечым абстрактным.

●

**НА ЗДЫМКАХ: на мітынгу ля помніка ахвярам Лунінецкага гета выступілі госці з Ізраіля Доў Левін і Йоханан Ахітуў;**

**побач з курганам Славы, дзе пакояцца астанкі больш 4-х тысяч расстраляных і закатаваных лунінчан, узведзены помнік адным з апошніх ахвяр фашызму.**







...СОНЦА не выходзіла ў той дзень. Быў яшчэ не позні час, але здавалася, што змрок ужо агарнуў зямлю. Поле за Лахвай і помнік на ім.. Абеліск, абавіты зверху цярновым вянком.

—Што можа быць высакародней за гэты сімвал пакут, амаль дзве тысячы гадоў назад скаваўшы чало Ісуса Хрыста?!— проста тлумачыць творчую ідэю скульптар Акадэміі мастацтваў Беларусі Уладзімір Слабодчыкаў, які разам з архітэктарам Ігарам Марозавым прымаў удзел у рэканструкцыі помніка. —Зразумела, напэўна, і шасцікутная зорка Давыда. Ганебны знак, якім фашысты пазначалі яўрэяу, каб усе цураліся іх, стаў дзяржаўным сімвалам Ізраіля.

На мармуровых плітах брацкай магілы —доўгі спіс прозвішчаў і імёнаў сем'яў ахвяр Лахвенскага гета. Ліхтштэйн, Мураўнік, Хейфец...

**З акта расследавання злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на часова акупіраванай тэрыторыі Лунінецкага раёна:**

„У наваколлях м. Лахва выяўлена:

а)магіла размерам 25х2х2,5 метра на зямлі Лахаўскага рыбгаса на адлегласці 50 метраў на захад ад прасёлачнай дарогі Лахва — хутары Перунова і 40 метраў на поўдзень ад чыгункі Лахва — Мікашэвічы, у якой пахаваны 1.946 трупаў яўрэйскага насельніцтва м. Лахва, у тым ліку 698 жанчын і 724 дзіцяці;

б) 14 магіл розных памераў, размешчаных побач з яўрэйскімі могілкамі ва ўрочышчы „Паповая гара", у якіх пахаваны 189 чалавек мясцовага насельніцтва, у тым ліку 77 жанчын і 34 дзіцяці, 283 ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі..."

МІТЫНГ-рэквіем пачаўся жалобнай песняй. Старшыня раённага Савета народных дэпутатаў П.А. Скарабагацька аб'явіле хвіліну маўчання.

Доўгі пералік пацярпеўшых лунінецкіх вёсак. „Камісія, грунтуючыся на матэрыялах следства, апытання відавочцаў і агляду месцаў пахавання ахвяр фашысцкага тэрору ўстанавіла, што за перыяд часовай акупацыі тэрыторыі Лунінецкага раена нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 12.453 чалавекі мірных савецкіх грамадзян, у тым ліку жанчын 4.437 і дзяцей 3.674, павешаны 132 чалавекі, у тым ліку 11 жанчын, спалена жывымі 607 чалавек, у тым ліку жанчын 203, дзяцей 221, забіта і закатавана ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі 3.242 чалавекі, загінулі ў выніку нямецкай паветранай бамбардзіроўкі 203 чалавекі... усяго 17.637 чалавек".

Амаль 18 тысяч загінуўшых мірных жыхароў. У памяць аб іх запальваюцца 18 свечак. Не саромеюцца сваіх слёз людзі, прыйшоўшыя на мітынг. Сярод іх — тыя, каму пашчасціла выратавацца ад карніцкіх акцый. Розныя потым былі лёсы, але для многіх чорныя дні знішчэння мірнага насельніцтва сталі кропкай адліку новага жыцця.

Ахвярамі вайны былі і мірныя жыхары, і тыя, хто загінуў са зброяй у руках. Таму другая частка мітынгу адбылася у цэнтры Лахвы, ля помніка воінам і

*партызанам. Напэўна, уся веска сабралася падзяліць смутак па загінуўшых. Тут жа— дэлегацыя былых ураджэнцаў Лунінеччыны, якія цяпер жывуць у Ізраілі, госці з Мінска, Пінска, Лунінца, з многіх вёсак раёна. У цырымоніі ўскладання вянкоў і кветак прынялі ўдзел старшыня райсавета, народны дэпутат Рэспублікі Беларусь П.А. Скарабагацька і яго намеснік В.В. Космач, старшыні сельсаветаў, на тэрыторыі якіх знаходзяцца вёскі, найбольш пацярпеўшыя ад фашыстаў, Лахвенскага — М.Н. Цяльпук, Сінкевіцкага — В.І. Сцепанюк, Дварэцкага — Ф.Д. Велясюк, Гарадоцкага — С.П. Петрасюк, старшыня калгаса „Новае Палессе” В.С. Гаргун, намеснікі старшыні гарсавета Л.М. Гарбатоўская і райвыканкама Л.Г. Молчан.*

*Напамінам пра ракавыя саракавыя гады гучалі песні ў выкананні народнага хору ветэранаў вайны і працы „Спадчына”.*

*„Сёння ўвесь свет павінен маўчаць, хоць бы з нагоды аднаго нашага мітынгу”, — сказаў А.П. Ярохін, старшы метадыст арганізацыйна-метадычнага цэнтра „Памяць” Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.*

*Але маўчаць не маем права, працягваў ён. Мы павінны ва ўвесь голас гаварыць аб былой трагедыі, каб не прыйшла на нашу зямлю трагедыя новая.*

*Мітынг скончыўся — і зноў настала цішыня ля помнікаў, абеліскаў і брацкіх магіл... Справа, урэшце, не ў помніках. Справа ў людской памяці.*



●

***НА ЗДЫМКАХ:** дзень памінання ахвяр вайны сярод мірнага насельніцтва. На мітынгу ў Лахве выступае старшыня раённага Савета народных дэпутатаў П.А. Скарабагацька; ускладаюцца вянкі і кветкі да помніка загінуўшым воінам і партызанам; мітынг-рэквіем ля абеліска ахвярам Лахвенскага гета; кветкі і свечкі ў памяць пра загінуўшых; даніна памяці — Копл Калпаніцкі (справа) і яго загінуўшы брат Моўша.*

●













*НА ЗДЫМКАХ:* ***бясконцы паток людзей да помніка ахвярам яўрэйскага гета ў Кажан-Гарадку, на мітынгу выступае кіраўнік дэлегацыі з Ізраіля Доў Левін (уверсе); ва ўскладанні кветак да помніка загінуўшым воінам і партызанам у Дрэбску прынялі ўдзел савецкія і гаспадарчыя кіраўнікі, госці з Ізраіля (унізе).***





*НА ШЧОДРА палітай крывёю зямлі, што трымала бой з ворагам, шмат святых для кожнага патрыёта месцаў. Вядомы армянскія крыніцы памяці, у гонар загінуўшых запальваюць вечны агонь, насыпаюць курганы, высаджваюць дрэвы, закладваюць паркі.*

*Традыцыйныя месцы масавых зборсў на Лунінеччыне таксама прысвечаны пераважна ваенным падзеям. Абеліскі на брацкіх магілах у гарадскім скверы, помнікі загінуўшым землякам у цэнтрах вёсак.*

*Да адных з самых уражваючых месцаў Лунінеччыны цяпер будзе належыць і добраўпарадкаваны мемарыяльны ансамбль на месцы захавання ахвяр Кажан-Гарадоцкага гета.*

*Маляўнічае месца на ўскрайку вёскі. Некрутыя прыступкі бетоннай сцяжынкі вядуць скрозь сасновы бор да двух узвышшаў, паміж якімі знаходзіцца брацкая магіла 937 яўрэяў, расстраляных 3 верасня 1942 года. Мармуровыя пліты, як накрыўка вялікай труны, пакрываюць зямлю, а ў цэнтры іх — клумбы з чырвонымі кветкамі, быццам кроплі крыві дагэтуль праступаюць праз пласт дзесяцігоддзяў. І цягнуцца да неба пасляваенныя стройныя дрэўцы, сімвалізуючы прагу да жыцця — найвялікшае імкненне чалавека.*

*Тут можна пастаяць, схіліўшы галаву ў памяць пра загінуўшых. Тут можна пасядзець, разважаючы над вечнымі пытаннямі быцця. І ў думках выказаць удзячнасць стваральнікам гэтага мемарыяльнага ансамбля — Пятру Аронавічу Уліцкаму, кіраўніку ўнутрыарэнднага прадпрыемства па вытворчасці тары пры калгасе-камбінаце „Крыніца", які прафінансаваў гэтую работу, і дырэктару гэтай жа гаспадаркі Мікалаю Мікалаевічу Лятчэні, дзякуючы арганізацыйным намаганням якога яна рабілася. Няхай і надалей спадарожнічае ім поспех у працоўных справах, таму што гэтыя людзі жывуць, як і належыць сапраўдным гаспадарам зямлі: дбаючы пра сённяшні і будучы дабрабыт, не дазваляючы мінуламу зарастаць травой забыцця.*

*САМЫЯ красамоўныя пачуцці ад асэнсавання былых трагедый канцэнтруюцца ў помніках. Але не толькі яны захоўваюць і водбліскі агню, і перадсмяротныя крыкі жанчын, і плач дзяцей, і аўтаматныя чэргі, і стогны тых, хто памірае ад куль... Амаль не засталося ўжо жывых відавочцаў трагедый. Але хіба бясстрасныя архіўныя дакументы змогуць перадаць жудасць вайны так, як іх захавала ўражаная чалавечая памяць?!*

*Стань маім болем,*
*уваскрэсні лесам,*
*Сястра Хатыні — вогненная*
*вёска,*
*Сітніцкі Двор...*

*Колькі іх было, сясцёр Хатыні? Больш 5 тысяч на Беларусі, з іх — 511 — не адноўленых... На Лунінеччыне адна з наўвялікшых трагедый адбылася 12 лістапада 1942 года.*

*Сітніцкі Двор. Боль не аднаго паэта Міколы Федзюковіча, чые радкі прыведзены вышэй. З многімі відавочцамі трагедыі ў свой час сустракаўся Мікола Калінковіч, які і занатаваў іх расказы ў кнізе „Лунінец".*

*„І.П. Шулякоўскі — ляснік Сінкевіцкага лясніцтва...*

*— Так што расказаць, як расстрэльвалі?— Іван Паўлавіч апусціў вочы, закрыў іх, як у сне, вымавіў: — Забіты род. Вось і ўсё. Адзінаццаць чалавек забіта. Адзін я застаўся, як перст. Радзіме аддаў усе, што патрабавалася. Узнагароды? Звычайна пытаюцца пра іх. Вось яны, глядзіце... Пасля таго, як усіх забілі ў Сітніцкім двары, вайну прайшоў. І ў партызанах, і на фронце...*

*Сумняваўся я — куды падзецца. Родную хату ворагі спалілі. І працаваць трэба было. А кім? Паступіў у лясніцтва. Ахоўваць лес вырашыў, як ён нас ад фашыстаў укрываў. Хатай ён нашай быў, роднай хатай. Вось так з лесам і жыву. Пяць тысяч гектараў за мной... А расстрэльвалі там, кіламетры два адсюль. Кроў цякла праз дарогу..."*





***НА ЗДЫМКАХ:** зноў і зноў памяць вяртае Паўла Максімавіча Ванюка ў той трагічны дзень 1942-га года, калі былі расстраляны 83 яго аднавяскоўцы з Ракітна, да помніка, куды ён часта прыходзіць з кветкамі.*

***З актаў расследавання злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на часова акупіраванай тэрыторыі Лунінецкага раёна:***

*„7 снежня 1942 года ў вёсцы Ракітна немцамі расстраляны 83 чалавекі..."*

*— Я таксама быў у іх чорным спісу,—успамінае Павел Максімавіч Ванюк.— У пачатку 1940 года мяне выбралі дэпутатам сельсавета, удзельнічаў актыўна ў будаўніцтве новага жыцця. У вайну, калі немцы ачапілі вёску і пачалі забіраць савецкіх актывістаў, мяне дома не было — працаваў у той час на чыгунцы ў Лунінцы. Калі ж даведаўся пра знішчэнне аднавяскоўцаў, адразу падаўся да партызан.*

*Разам з атрадам імя Варашылава брыгады імя Будзённага П.М. Ванюк удзельнічаў у многіх баявых аперацыях. Пасля вызвалення Беларусі працягваў ваяваць у дзеючай арміі. Закончыў вайну — і так жа аддана працаваў у калгасе.*

*А ў вялікай брацкай магіле ляжаць сваякі і аднагодкі Паўла Максімавіча, якія загінулі 50 гадоў назад. Цудам пашчасціла выратавацца ў той дзень ад смерці яшчэ тром жыхарам вёскі Ракітна: Васілю Усцінавічу Туркевічу, Вользе Гаўрылаўне Аліфяровіч, Уладзіміру Ульянавічу Калянковічу. Дай Бог надалей здароўя гэтым людзям, жывучым за сябе і за сваіх сяброў, якія вечным сном спяць пад гранітнай плітой пад шэпт лісця дрэў...*

# КАГО ПАМЯТАЕМ, ЖЫВУЦЬ

*„У БРАТСКИХ могил нет заплаканных вдов..."–заўважыў некалі паэт. І сапраўды, людзі часцей спяшаюцца на магілы сваіх непасрэдных продкаў. А сюды і родныя не наведваюцца, бо не засталося іх... Скончыліся дні памінання – і зноў цішыня ля гарадскіх і вясковых абеліскаў, якіх так шмат на гаротнай Лунінеччыне. Нельга, канешне, сказаць, што ніхто пра іх не клапоціцца, але ўсё ж прыходзім сюды звычайна некалькі дзён у годзе – на Дзень Перамогі, дзень вызвалення, яшчэ на нейкае свята... І добра, што прыходзім, што не згасла памяць. А ў астатнія дні застаюцца маўклівыя абеліскі сам-насам са сваімі думкамі і ўспамінамі. А недзе і наогул няма тых абеліскаў, як няма дагэтуль ніякага помніка на месцы знішчанай вёскі Белае Возера – адзінай з лунінецкіх вёсак, што не аднавілася пасля вайны. Можа, выправім сваю памылку і паставім помнік – напамін пра яе?*

*Але не толькі ў помніках з каменю і мармуру справа. Як раз у гэты час у раёне вядзецца праца над стварэннем гісторыка-дакументальнай хронікі „Памяць". Не аднойчы друкавала газета спісы загінуўшых – па кожнай вёсцы і па горадзе. І ў будучых нумарах гэтыя спісы будуць з'яўляцца. Але часам даводзіцца чуць: „Каму яны патрэбны, гэтыя спісы? Толькі месца ў газеце займаюць".*

*Падобныя выказванні звычайна можна пачуць ад людзей параўнаўча маладых, якіх не закранула вайна. Але куды большае здзіўленне і абурэнне выклікаюць тыя ж словы з вуснаў асобных прадстаўнікоў старэйшага пакалення (ёсць і такія выпадкі). Няўжо і яны забыліся пра трагічныя падзеі вайны? Амаль кожную сям'ю лунічан у той ці іншай ступені вайна закранула. Але калі нават усе, дзякуй Богу, засталіся ў жывых, няўжо не кранае такую сям'ю гора суседзяў? Ці можна нечаму здзіўляцца ў наш час усеагульнай бездухоўнасці і страты гістарычнай памяці? Вось і гучаць часам словы пра сталіністаў-ветэранаў, якім не трэба было перамагаць Гітлера, бо тады і ў нас „дойчамаркі" былі б у грашовым звароце... Балюча і горка чуць такое.*

*І немалая роля ў аднаўленні духоўнасці народа належыць напісанню сапраўднай нашай гісторыі – гісторыі пакут і перамог, здрад і высакародства. Наўрад ці такую працу здолеюць выканаць нават самыя высокаадукаваныя гісторыкі, калі не дапаможам ім усе мы. Не аднойчы звярталіся „Лунінецкія навіны" з заклікам да землякоў – прымайце актыўны ўдзел у стварэнні Кнігі „Памяць"! Вашы ўспаміны, успаміны вашых родных, – гэта непаўторныя сведчанні гісторыі, бо кожны чалавек непаўторны і па-свойму бачыць падзеі. Канешне, лёгка застацца ў баку і толькі потым з'едліва крытыкаваць недахопы і памылкі, але значна сумленней і высакародней самому прыняць удзел у працы, дапамагчы, падказаць. Нашы дзверы заўсёды адчынены для шчырага супрацоўніцтва.*




*Часцей за усё ў спісах загінуўшых пра чалавека змешчаны толькі самыя асноўныя звесткі, бо невядома пра яго больш. Але ж практычна пра кожнага чалавека можна было б напісаць цэлую кнігу, бо што можа быць цікавей і значней за чалавечыя лёсы?! Жывыя яшчэ сябры і родныя кагосьці з загінуўшых... Чакаем іх лістоў. Пройдуць гады, а Кніга „Памяць" застанецца напамінам нашчадкам. Няўжо хочам, каб і яны зняважліва калі-небудзь адазваліся пра нас?*

*Давайце ж падтрымаем гэтую справу, што павінна стаць агульнанароднай.*

●●●

***НА ЗДЫМКУ:** гэты вымпел выраблены мінскім кааператывам „Сувенір" па эскізу Ігара Марозава спецыяльна да дзён памінання ахвяр вайны сярод мірнага насельніцтва Лунінеччыны.*

Галоўны рэдактар А. М. ВЫШЫНСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 225650, г. Лунінец, Брэсцкая вобласць, пл. Леніна, 12.

Спецвыпуск „ЛН" падрыхтавалі А. ВЫШЫНСКІ, В. ЖЫЛКО, Т.КАНАПАЦКАЯ, Р. ЖУК.

Газета набрана на электроннай наборна-друкавальнай машыне, аддрукавана афсетам у Пінскай гарадской друкарні ўпраўлення па друку Брэсцкага аблвыканкама. 225710, г. Пінск, вул. Леніна, 42.
Тыраж 8.236 экз.